# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ СЛОЎНІКАВАЙ ПРАЦЫ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ЧАСЦІН МОВЫ

***Шыманская Н. М.*** *(УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, г. Мазыр)*
***Навуковы кіраўнік*** *– Б. А. Крук, канд. філал. навук, дацэнт*

Слова з'яўляецца аб'ектам вывучэння ў кожным раздзеле пачатковага курса беларускай мовы, таму работа па ўзбагачэнні слоўнікавага запасу вучняў праводзіцца на ўсіх узроўнях моўнай сістэмы.

Пытанні, звязаныя з узбагачэннем дзіцячага слоўніка, культуры маўлення заўс еды былі ў цэнтры ўвагі метадыстаў і настаўнікаў. У сучаснай методыцы навучання рускай мове знайшлі адлюстраванне розныя пытанні развіцця маўлення (В. К. Ягадоўскі, А. Н. Мацвеева і інш.).

Вядомы расійскі метадыст М. Р. Львоў вылучае дзве ступені культуры маўлення: 1) правільнасць, нарматыўнасць маўлення; 2) майстэрства, уменне выбраць найбольш дакладны, выразны, яркі варыянт выказвання. Аднак нават карысныя рэкамендацыі, якія змяшчаюцца ў працах рускіх метадыстаў, не заўс еды прымальныя пры навучанні школьнікаў беларускай мове, якая мае шмат сваіх асаблівасцей.

Тэарэтычнай асновай дадзенага даследавання паслужылі работы метадыстаў, якія займаюцца пытаннямі методыкі выкладання літаратурнага чытанння і беларускай мовы, узбагачэння слоўнікавага запасу (Г. М. Валочка, В. П. Красней, В. А. Ляшчынская, М. П. Лукашук, Л. П. Падгайскі, М. Г. Яленскі, І. І. Паўлоўскі, В. І. Свірыдзенка [4; 5], Г.М. Федаровіч [6], І. І. Горбач [2] і інш.).

У сучаснай моўнай адукацыі вялікая ўвага надаецца ўзбагачэнню і актывізацыі слоўніка вучняў пры вывучэнні часцін мовы. Значнасць раздзела "Часціны мовы" для ўзбагачэння слоўніка ў школьным курсе вывучэння мовы падкрэсліваюць многія даследчыкі [1]; [3]; [4]. Але трэба адразу адзначыць, што ўзбагачэнне слоўнікавага запасу вучняў – надзвычай складаная задача навучання мове, паколькі да апошняга часу ў настаўніка маецца шэраг пытанняў, у прыватнасці такіх, як: колькі слоў і якія неабходна ўключаць для азнаямлення, засваення вучнямі за адзін ўрок, за перыяд навучання ў асобным класе і за ўвесь перыяд навучання? На жаль, і с ення не вызначаны лексічны мінімум вучняў, калі яны прыходзяць у школу, калі заканчваюць пачатковую школу. Ус е гэта вымушае настаўніка быць самастойным у адборы лексікі да ўрокаў мовы, кіравацца сва ей інтуіцыяй, адчуваннем слова, вопытам.

У час вывучэння марфалогіі вучні зна емяцца ў апісальнай форме з граматычным ладам беларускай мовы, засвойваюць (тэарэтычна і практычна) найважнейшыя граматычныя правілы аб змяненні слоў, спалучэнні іх у словазлучэнні і сказы, ужыванні ў тэкстах, прыводзяць у сістэму і асэнсоўваюць вядомыя ім з папярэдняга вучэбнага вопыту шматлікія факты мовы, практыкуюцца ў прымянені вывучаных граматычных правілаў і звестак у вусным і пісьмовым маўленні.

Вывучэнне марфалогіі дапамагае школьнікам засвоіць формы словазмянення, правільна ўжываць гэтыя формы пры пабудове словазлучэнняў і сказаў, удасканальвае граматычны лад мовы, спрыяе засваенню частак слова пры па ўтварэнні часцін мовы.

Вынікі нашага эксперыментальнага даследавання па выяўленні ўплыву спецыяльных практыкаванняў на развіцц е слоўніка вучняў у працэсе вывучэння часцін мовы, якое праводзілася на базе 4 класа ДУА "Засінцаўская базавая школа Ельскага ра ена" і 4 класа ДУА "Рамязоўскі яслі-сад-сярэдняя школа Ельскага ра ена" Гомельскай вобласці, паказалі:

- узровень слоўнікавага запасу вучняў эксперыментальнага 4 класа "Засінцаўская базавая школа Ельскага ра ена" на ўроках беларускай мовы пасля правядзення навучальных заняткаў павысіўся на 32,5 %;

- у кантрольным 4 класе ("Рамязоўскі яслі-сад-сярэдняя школа Ельскага ра ена") ўзровень слоўнікавага запасу вучняў на ўроках беларускай мовы павысіўся на 20 %.

Такім чынам, узбагачэнне слоўніка пры вывучэнні часцін мовы праходзіць не толькі праз спецыяльныя практыкаванні, а забяспечваецца ўсімі відамі дзіцячай дзейнасці і ажыццяўляецца праз слоўніковую работу, пад якой разумеецца мэтанакіраваная дзейнасць настаўніка, якая спрыяе засваенню вучнямі лексічнага складу мовы.



МГПУ им. И.П.Шамякина

## Літаратура

1. Свірыдзенка, В. І. Выкарыстанне заданняў займальнага характару пры зна емстве малодшых школьнікаў са спражэннем дзеяслова / В. І. Свірыдзенка // Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа. – 2014. – № 3. – С. 9–17.

2. Свірыдзенка, В. І. Выкарыстанне кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў па беларускай мове для ацэнкі эфектыўнасці фарміравання маўленчай культуры вучняў 4 класа / В. І. Свірыдзенка // Пачатковая школа. – 2017. – № 11. – С. 5.

3. Федаровіч, Г. М. Праблема маўленчага развіцця малодшых школьнікаў: тэорыя і практыка навучання / Г. М. Федаровіч // Народная асвета. – 2008. – № 7. – С. 33–36.

4. Горбач, І. І. Узбагачэнне слоўнікавага запасу школьнікаў на ўроках беларускай мовы / І. І. Горбач // Пачатковая школа.– 2016. – № 9. – С. 22–23.